# 26 ЛІСТАПАДА -- 54 ГАДЫ З ДНЯ ВЫЗВАЛЕННЯ ГОМЕЛЯ АД ГІТЛЕРАЎСКІХ АКУПАНТАЎ

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

Гомельскі універсітэт

№16 (936) | Аўторак, 25 лістапада 1997г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ФРАНЦУЗСКІЯ ДЫПЛОМЫ ЎРУЧАНЫ

Жыццё, якім бы яно ні было -- эканамічна стабільнае ці складанае -- усё роўна скарацечнае. Здаецца, яшчэ зусім нядаўна былі ўстаноўлены двухбаковыя сувязі паміж нашым універсітэтам і Оверньскім універсітэтам горада-пабраціма Клермон-Феран, а ўжо мінула чатыры гады. За гэты час была зацверджана праграма ТЭМПУС, якая фінансуецца Еўрапейскім супольніцтвам з мэтай аказання ўсямернай дапамогі вышэйшай школе былых рэспублік СССР, у тым ліку Беларусі і, у прыватнасці, нашаму універсітэту. Аб выніках выканання гэтага міждзяржаўнага праекта мы паведамлялі ўжо неаднаразова. Адзначалася як адно з важнейшых дасягненняў -- стварэнне на базе ГДУ Франка-Беларускага інстытута кіравання, які стаў на сваім пачатку не маючай аналагаў, унікальнай міждзяржаўнай вышэйшай навучальнай установай.

У летапісу плённага супрацоўніцтва універсітэтаў гарадоў-пабрацімаў 19-га лістапада г.г. стала гістарычнай вяхой. У гэты дзень 13 студэнтам эканамічнага факультэта і спецыяльнасці "Праваазнаўства", якія паспяхова закончылі Франка-Беларускі інстытут кіравання, былі ўручаны французскія дыпломы. Знамянальна, што беларускія выпускнікі атрымалі іх з рук пасла Францыі ў Рэспубліцы Беларусь пана Бернара Фасье, які ўпершыню наведаў Гомель пасля нядаўняга свайго назначэння на высокую дыпламатычную пасаду.

Перад азнаямленнем з Франка-Беларускім інстытутам кіравання і ўручэннем яго выпускнікам французскіх дыпломаў у зале пасяджэнняў Савета універсітэта адбылася сустрэча з паслом Францыі ў нашай краіне панам Бернарам Фасье і французскай дэлегацыяй. На ёй рэктар нашага універсітэта член-карэспандэнт НАН Беларусі,



На здымку: французскі дыплом уручаны Вячаславу Шпаку са спецыяльнасці "Праваазнаўства". Фота У.Чысціка.

акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі Л.А.Шамяткоў і віцэ-прэзідэнт Оверньскага універсітэта па міжнародных сувязях, садырэктар Франка-Беларускага інстытута кіравання прафесар Морыс Шэневуа падрабязна расказалі аб стварэнні і першых этапах станаўлення ўнікальнай міжнароднай ВНУ і аб тых цяжкасцях, якія давялося пераадольваць. Поспех забяспечаны, дзякуючы падтрымцы ў гэтай справе французскага і беларускага ўрадаў, пасольства Францыі ў Рэспубліцы Беларусь, Міністэрства адукацыі нашай краіны.

Пра ўсё гэта было сказана Л.А.Шамятковым і Морысам Шэневуа і перад шырокай аўдыторыяй студэнтаў і выкладчыкаў, якія сабраліся на ўрачыстае уручэнне французскіх дыпломаў у ауд. 2-26 пятага вучэбнага корпуса. Было адзначана таксама, што ў Франка-Беларускага інстытута -- вялікая перспектыва. Ён, па словах Морыса Шэневуа, значна пашырыць свае рамкі, з цягам часу набудзе сусветную вядомасць. Ужо ў пачатку наступнага года французскі бок гатовы прыняць 40 нашых студэнтаў.

Перад уручэннем выпускнікам інстытута французскіх дыпломаў з цёплымі віншавальнымі словамі і пажаданнямі выступілі старшыня Гомельскага аблвыканкома М.Р.Вайцянкоў, старшыня гарвыканкома С.В.Шапавалаў, якія расказалі пра вытокі супрацоўніцтва гарадоў-пабрацімаў і яго неацэнным значэнні на цяперашнім этапе сацыяльна-эканамічнага развіцця, начальнік Упраўлення вышэйшай школы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь В.М.Дабранскі.

З асаблівай увагай было выслухана выступленне пасла Францыі пана Бернара Фасье. Ён даў высокую ацэнку дзейнасці міждзяржаўнага інстытута кіравання і выказаў упэўненасць, што цяперашнія і будучыя выпускнікі многае зробяць для развіцця далейшага супрацоўніцтва двух універсітэтаў, Беларусі і Францыі.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

## ЮБІЛЕЙ "ГОМЕЛЬСКАЙ ПРАЎДЫ"

Споўнілася 80 гадоў з дня выхаду ў свет першага нумара абласной газеты "Гомельская праўда" (першапачатковая назва "Известия Гомельского Совета рабочих и солдатских депутатов"). З нагоды гэтай падзеі 14 лістапада ў Гомельскім абласным драматычным тэатры адбыўся ўрачысты вечар. Ад калектыву нашага універсітэта юбілярам цёпла павітаў са знамянальнай падзеяй і ўручыў прывітальны адрас рэктар член-карэспандэнт Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі Л.А.Шамяткоў.

## НАЗНАЧАНЫ РЭКТАРАМ

Са згоды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі рэктарам Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута назначаны загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін нашага універсітэта доктар біялагічных навук, прафесар Валянцін Васільевіч Валетоў.

К ИТОГАМ КОНКУРСА "А НУ-КА, ПЕРВОКУРСНИК!"

# " 8 ЧАСОВ, ПОТРЯСШИЕ УНИВЕРСИТЕТ"



В атмосфере дух конкурса "А ну-ка, первокурсник!" витал задолго до самого дня проведения. Особенно это чувствовали коменданты всех корпусов, так как репетиционных помещений во втором в Республике Беларусь университете лишь несколько, да и те не могут стать резиновыми.

Возник и вопрос, как почти из 5-тысячного студенческого контингента, не говоря о профессорско-преподавательском составе (у которого большое количество детей и их друзей), достать билет в актовый зал на 600 мест? А организаторы конкурса к тому же, дабы не держать участников на улице -- 240 человек -- возьми, да посади их на ряды галерки зала. В итоге желающие попасть решали задачку, как стать обладателем одного из 478 билетов. Поздравляю всех, кто эту задачку решил! Попал! Увидел!

А увидели 9 ноября 9 программ на обязательную тему "Этот город -- самый лучший город на земле".

Газета "Гомельскі універсітэт" уже представляла положение конкурса. Думаю, что надо напомнить лишь некоторые из них, чтобы было легко ориентироваться:

-- цельность программы;
-- раскрытие темы;
-- качество номеров в программе;
-- выдержанность жанра.

Впервые в этом году зал увидел в конкурсном марафоне коллектив студентов отделения "Психология". Ребята рискнули, дерзнули и, научившись, я думаю, именно на своих ошибках (уточню, что старших курсов научить, надоумить, подсказать или исправить у них нет), приобрели уже первый опыт творческой борьбы. Лично мне понравилась уверенность в необходимости заявить о себе, смелость этой маленькой группы на фоне многочисленных факультетов, самоотверженность вынести свои таланты на оценку. И в итоге среди 13 участников трое -- лауреаты конкурса этого года: Татьяна Демеш, Татьяна Янкова и Галина Грищенко. И назову фамилию участника СТЭМа, которому, наверняка, ребята будут благодарны. Это Сергей Больсевич, который был помощником и консультантом в подготовке программы. Ну, а последнее место? ... Так ведь первый блин комом. Подождем и попробуем второй, но уже выпечки 1998 года. Удачи вам, будущие психологи!

Тяжело принималось решение членами жюри о присвоении восьмого места студентам первого курса физического факультета. Именно они в последний день октября порадовали культурный центр выступлениями на таком же факультетском конкурсе. Певчие голоса? -- Пожалуйста! Кстати, за высокое исполнительское мастерство песен лауреатом стал Александр Казимиров, а финальная песня программы стала финальной и на концерте лауреатов конкурса. Танцоры? -- Пожалуйста! Актеры первых и вторых ролей! Неплохая выдержанная идея выступлений обеих групп физиков. Толковые творческие старшие курсы. Да что говорить, если основной костяк любимого всеми СТЭМа -- это физики! Неужели показать после этого конкурсную университетскую программу помешало мытарство ребят в поисках репетиционных помещений? Может быть, незаинтересованность самого факультета, деканата ? Что случилось, трудно объяснить и самим ребятам. Неотрепетированная по исполнению, недоведенная по смыслу программа оставила тяжелое впечатление безысходности во всем. Вот после этого вдруг настоящими, живыми, веселыми лицами и характерами зазвучала финальная песня о любви к родному городу. Но было уже не интересно.

**СТРОКИ ДЛЯ РАЗМЫШЛЕНИЯ**

*"А когда зашли мы в актовый зал БелГУТа, то сразу бросилось в глаза присутствие на рядовом концертном мероприятии ректора, проректоров, множество преподавателей,наверное, и деканы были."*

**(Из высказываний студентов)**



**Фрагмент конкурсной программы первокурсников матфака**

Не менее непонятными показались в этом году будущие экономисты, а точнее их программа, их город. Оно, конечно, я им верю, "речицкое пиво" лучшее в актовом зале, клоуну программы, действительно, не выспаться никогда, если он проживает в общежитии университета, а кроме как на спичечных коробках и сыграть ни на чем не смогли. Я уже не говорю о том, что в конкурсной программе неплохие выдержки новостей не нашлось кому зачитать из 5 групп первого курса экономического факультета. И, спасибо, им помог выпускник физического факультета. Вообще, к сожалению, программа экономистов, опять же при наличии талантливых ребят, среди которых лауреатами стали Руслан Зарипов, Светлана Авдеева, Андрей Мазур -- не оставила шансов занять призовое место. В итоге они оказались седьмыми.

То ли устали уже к самому выступлению, то ли слишком осторожно выступили на конкурсе будущие филологи. Пытаясь представить свой город мечты, город Рио, участники показывали аккуратненькую программу с боязнью сделать что-то не так. Порой с каким-то школьным представлением о конкурсных концертах. Как всегда хорошими были многочисленные танцы, великолепно прозвучали песни. Приятно, что и среди филологов в этом году стали лауреатами Татьяна Кузьменкова, Анна Самоховец, Татьяна Железко, Татьяна Корхова, Ольга Сухомеро. Но вот общее впечатление от программы и у жюри (без споров), и у зала привело ребят лишь к шестому месту в этом году. А ведь есть у первокурсников-филологов этого года творческий талант и, я думаю, большие возможности. Остается надеяться и ждать.

Больше всего споров вызвало выступление историко-юридического факультета. Риск ребят представить серьезную, вдумчивую, больше философскую программу был оправдан лишь в том, что давно пора молодежи подумать и о душе, приблизиться к более высокой культуре, вспомнить о том, на чьих примерах нам стоит начать взвешивать уже свои поступки и свою жизнь. Задача трудна была для них прежде всего потому, что зал был не готов воспринимать девятую по счету программу в таком ключе. Не удалось ребятам выдержать выбранный театральный жанр, создав программу без привычных зрителям мало-мальских декораций и большего, чем одного-двух человек на сцене. Да и времени на то, чтобы придумать, осознать, отрепетировать, представить зрителю такой жанр и идею -- месяца, видимо, мало. Ведь первокурсники в этой области творчества все же любители. Как всегда хорошими были отдельные номера и исполнители: Елена Круковская, Александр Кипель, Алексей Мурашко, лауреаты конкурса -- Виктор Комков, Виталий Ключинский, Вероника Гапонюк. Что ж? В этом году -- первокурсники (в спорах жюри) -- пятые.



К ИТОГАМ КОНКУРСА "А НУ-КА, ПЕРВОКУРСНИК!"

" 8 ЧАСОВ, ПОТРЯСШИЕ УНИВЕРСИТЕТ"



**Цветы -- лауреату конкурса Галине Ермаковой с биологического факультета.**

Четверка первых удивила в конкурсе этого года всех. Удивила по -хорошему, убедила, что могут (надо только захотеть и постараться). Нарушила привычный, к сожалению, порядок распределения мест за несколько последних мест.

Четвертыми оказались первокурсники геолого-географического факультета, которые тоже, своего рода, рискнули показать далеко не КВНовскую программу. Их город, где место под солнцем завоевывает себе любовь к матери-природе, к женщине, к мирной жизни из глубины веков на примере греческого города -- удался. Программа оказалась выдержанной и в идейном, и в музыкальном (песни и танцы) плане, цельной и антуражно подготовленной. Интересные тексты (коих было чуточку многовато) были удачно и интересно срифмованы. Молодцы, ребята, а среди них и лауреаты конкурса -- Оксана Гомонова, Денис Михасев, танцевальный коллектив факультета. В итоге -- молодцы. Закрепившись, -- дерзайте дальше.

Своим авантюризмом и нахальством, в хорошем понимании этого слова, желанием выйти вперед просто вынеслись к микрофонам первокурсники факультета физической культуры. Им было сложно. Ведь их предшественники оставили им в наследство последнее место, и 9 ноября они открывали конкурсную программу, а это всегда нелегко. Ребята, выбрав жанр КВНа, жанр, который действительно подходил команде по характеру, вполне справились. Программа была удачно напичкана словесной фразеологией, музыкальным оформлением. И думаю, что не только "Дося" помогла им, но и желание победить, сыграть, донести до зрителя уже не новую, но правильную мысль -- в гостях хорошо, а дома лучше. И "горячие гомельские парни" -- на третьем месте, а если не верите, то придите на первый курс факультета и почитайте "бэдж" у лауреата конкурса Валентина Абрамова.

Уж слишком насыщенной была программа биологического факультета. Создавалось впечатление, что не вместятся все таланты I-го курса факультета в 40-минутную программу со всеми текстами, песнями, танцами и событиями в поисках самого лучшего города. Следя за происходящей сменой действий, вытягивалась нить программы, но более запомнились отдельные номера и исполнители: в каком-то вечном сумбуре звучание одинокой трубы, поиски своего пути, встреча друзей и вновь дорога, ведущая в будущее, в город счастья, в свой город. Но как же много всего в программе и, конечно же, хорошо играющих ребят -- лауреатов конкурса: Виталий Литвинов, Валентин Быковский, Галина Ермакова. И еще Олег Толстенков, Ирина Жуковская, Оксана Калинкевич. Я поздравляю всех с удачным выступлением (2-е место!) и желаю сохранить традиции -- быть в призерах во всем.

Просто, но со вкусом, с настроением, цельно и выдержанно представили на суд зрителей и жюри свой город, свое местечко на карте, где ты обязательно будешь счастлив, потому, что ты нужен, как специалист, друг, любимый, человек -- математики. Мы окунулись в сон главного героя после распределения по окончании ВУЗа, и тут-то все и происходило. Хорошо сыграны роли почти всеми участниками программы, и конечно, лауреатские звания и призы заслуженно у Татьяны Масловой, Дениса Михайлова, Данилы Дегтярева, Елены Горбенко.

Генеральный спонсор -- компания "Стиморол" -- учредила свои призы общеуниверситетского конкурса "А ну-ка, первокурсник!" и участникам победившей команды. Каждому досталась фирменная майка компании, а также команде был вручен переходящий приз, на котором будет выгравировано имя победителя конкурса этого года -- математического факультета. Поздравляю всех, кто имел отношение к подготовке победителя.

Хочу поблагодарить от имени всего культурного центра прежде всего профком студентов университета, на выделенные средства которого были приобретены приятные многочисленные призы. Отдельное СПАСИБО всем оргкомитетам факультетов и многим деканам за подготовку и поддержку первокурсников.

Страница летописи конкурса 1997 года перевернута, но еще много чистых страниц в ее переплете. Каким он будет "А ну-ка первокурсник-98!"? Кто станет его непосредственными участниками? Какими будут его успехи и результаты?

**М.ШИРИНКИНА,**
**художественный руководитель культурного центра университета.**
**Фото В.Чистика.**

**Кнігі нашых вучоных**

# ВАЖКІ ЎКЛАД У ПЕДАГОГІКУ

Акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, доктар педагагічных навук, прафесар Іван Фёдаравіч Харламаў карыстаецца шырокай вядомасцю як глыбокі даследчык праблем школьнага навучання і выхавання не толькі ў нашай рэспубліцы, але і далёка за яе межамі. Яго навуковыя працы выдаваліся ў былым СССР (Маскве), саюзных рэспубліках, а таксама ў Чэхаславакіі, Кітаі і іншых замежных краінах.

Значны ўклад ён унёс у стварэнне дапаможнікаў і падручнікаў па педагогіцы для студэнтаў педагагічных інстытутаў і універсітэтаў. Можна без перабольшвання сказаць, што напісаныя ім падручнікі па гэтай дысцыпліне не толькі атрымалі высокую ацэнку студэнтаў і выкладчыкаў, але і па праву лічацца лепшымі сярод іншых падобных дапаможнікаў. Таму наўрад ці трэба лічыць выпадковым, што ў 1996 годзе ў новым выданні выйшаў яго падручнік па педагогіцы на беларускай мове, а нядаўна ён выдадзены ў Маскве на рускай мове з грыфам Міністэрства агульнай і прафесійнай адукацыі Расійскай Федэрацыі. Гэта робіць гонар не толькі іх аўтару, але і ўмацоўвае прэстыж нашага універсітэта, дзе І.Ф.Харламаў працуе з 1955 года і прайшоў шлях ад выкладчыка да буйнога вучонага, акадэміка, заслужанага дзеяча навукі Беларусі.

У сувязі з выхадам гэтых падручнікаў наш карэспандэнт папрасіў вучонага адказаць на некалькі пытанняў.

**-- Іван Фёдаравіч, якое значэнне Вы надаеце апошнім выданням Вашага падручніка ў нашай рэспубліцы і ў Расіі?**

-- Калі ўлічыць, што па звычаях, якія даўно склаліся, кожны прафесар павінен напісаць свой падручнік па той ці іншай навуцы, якую ён выкладае, то, напэўна, гэта трэба лічыць маім пэўным асабістым поспехам. Але галоўным з'яўляецца тое, што я, з'яўляючыся выкладчыкам, пастаянна ўдасканальваю змест, логіку і навуковы ўзровень нарматыўнага курса педагогікі. На мой погляд, такія яго фундаментальныя пытанні, як прадмет педагогікі, сутнасць выхавання і навучання, псіхолага-педагагічныя механізмы актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і асобаснага самаразвіцця навучэнцаў мной раскрыты больш грунтоўна, чым у дапаможніках іншых аўтараў, а часта і па-новаму. Таму кожнае выданне падручніка ўтрымлівае новыя тэарэтычныя ідэі, больш даступна для студэнтаў раскрывае шляхі эфектыўнага ажыццяўлення вучэбна-выхаваўчага працэсу.

У прыватнасці, істотна перапрацаваны і дапоўнены раздзелы аб формах вучэбнай работы ў школе, аб фарміраванні ў навучэнцаў асобасных уласцівасцей і якасцей. Пашыраны матэрыял аб нацыянальна-патрыятычным выхаванні ў нашай рэспубліцы. Усё гэта, на маю думку,




мае важнае значэнне для павышэння якасці прафесійна-педагагічнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў ва універсітэтах і педагагічных інстытутах, на што сур'ёзную ўвагу звярнуў Прэзідэнт Беларусі ў сваім выступленні на І з'ездзе настаўнікаў рэспублікі.

**-- Як Вы ацэньваеце сённяшні ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў да настаўніцкай дзейнасці?**

-- На мой погляд, у нашым універсітэце ёсць добры вопыт гэтай падрыхтоўкі і ёсць пэўныя поспехі. Нам удалося сінхранізаваць правядзенне лекцыйных і практычных заняткаў па педагагічных дысцыплінах, што дазваляе студэнтам глыбей авалодваць вывучаемым матэрыялам. Члены кафедры ўдасканальваюць тэарэтычны і метадычны ўзровень выкладання, чаму, дарэчы, дапамагаюць і выдадзеныя мной падручнікі. Мы павышаем патрабаванні да ведаў студэнтаў, а таксама вядзем паглыбленую даследчую работу па пытаннях навучання і маральнага выхавання. Гэта не можа не адбівацца на паляпшэнні іх педагагічнай падрыхтоўкі да настаўніцкай дзейнасці.

І ўсё ж задавальняцца гэтым нельга. Ёсць шмат перашкод. Студэнты перагружаны аўдыторнымі заняткамі, у іх не застаецца часу для сур'ёзнай самастойнай вучэбнай работы, што павінна быць галоўным у навучанні ў ВНУ. Наша кафедра выдае арыгінальныя падручнікі, але тыражы іх невялікія ды і каштуюць дорага, а універсітэт не мае сродкаў для іх набыцця. Вось і атрымліваецца, што выдадзенымі мной падручнікамі мае ж студэнты не могуць карыстацца. Не стымулюе іх педагагічную падрыхтоўку зніжэнне прэстыжу настаўніцкай прафесіі. З-за матэрыяльнай незабяспечанасці некаторыя студэнты вымушаны сумяшчаць вучобу з працай у школе або на вытворчасці. Таму нашы намаганні ў падрыхтоўцы будучых настаўнікаў маюць патрэбу ў больш канкрэтнай сацыяльна-эканамічнай падтрымцы.

**-- Ці не адбіваецца ўсё гэта на Вашай навукова-даследчай дзейнасці? Якія ў Вас задумы і планы?**

-- Як не адбіваецца! Я ўсё гэта цяжка перажываю і чакаю пераадолення часовых цяжкасцей. Але навуковую работу вяду даволі інтэнсіўна. Інакш не магу. Заняткі навукай -- гэта не абавязак, не павіннасць, а ў нейкай ступені захапленне. Ёсць нават такая іронія: заняткі навукай -- гэта задавальненне асабістай цікавасці вучонага за кошт дзяржавы. Спачатку, канешне, гэтая цікавасць аплачваецца дзяржавай, але потым, калі вучоны пачынае даваць навуковую прадукцыю, ён вяртае атрыманыя авансы, і яго працу ўжо нішто не спыніць. Новыя ж пытанні і патрабуючыя рашэння праблемы ўзнікаюць пастаянна. Не абыходзяць яны і мяне. Так, выклікае трывогу, што на многіх уроках у школах вучні не авалодваюць вывучаемым матэрыялам, таму іх паспяховасць працягвае заставацца нізкай. У сур'ёзным паляпшэнні, на мой погляд, мае патрэбу пазакласная выхаваўчая работа з навучэнцамі. Па гэтых пытаннях ёсць у мяне і тэарэтычныя, і метадычныя ідэі. Маю заказ аднаго беларускага выдавецтва на пятае выданне падручніка па педагогіцы на рускай мове, што патрабуе неадкладнай работы па яго ўдасканаленню. Нямала клопатаў выклікае падрыхтоўка маладых навуковых кадраў. Нядобра, напрыклад, адчуваю сябе, што пакуль ні адзін з маіх выхаванцаў не абараніў доктарскай дысертацыі. Як кажуць, спраў шмат, толькі паспявай працаваць. Але ў гэтым і заключаецца сэнс і пафас жыцця чалавека, які займаецца навукай.



# ШВЕЦЫЯ, ЯКУЮ БАЧЫЎ НЕАДНОЙЧЫ

(Працяг. Пачатак у №15)

Мова шведаў, як дацкая і нарвежская, адносіцца да прота-германскай. Гэта значыць, што выхадцы з германскіх плямёнаў у далёкім мінулым засялялі гэтую тэрыторыю.

Тэрытарыяльна Швецыя падзелена на лены, як Германія на землі або Швейцарыя на кантоны. Кіраўніком дзяржавы лічыцца кароль, вышэйшым заканадаўчым органам з'яўляецца рыксдаг (парламент). На працягу гісторыі то Данія, то Швецыя змагаліся за панаванне на Балтыйскім моры. Шведскія заваёвы распасціраліся да Ладагі і Ноўгарада.

У 1994 годзе ў г.Сігктуна, старажытнай сталіцы Швецыі, была арганізавана выстаўка манет і розных вырабаў, якія адносяцца да перыяду знаходжання шведаў на тэрыторыі Расіі. З разгромам шведаў у час праўлення караля Карла XII пад Палтавай шведы назаўсёды пазбавіліся імперскіх амбіцый, што дало ім магчымасць звярнуць усю ўвагу на ўнутранае добраўпарадкаванне сваёй краіны.

Я не думаю, што толькі багатыя запасы жалезнай руды, каляровых металаў і лесу склалі аснову дабрабыту краіны. Таму паслужылі і іншыя асаблівасці палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага характару.

У Швецыі, як і ў Англіі, пануе цвярозы розум. Шведы не кідаюцца з крайнасці ў крайнасць, скажам, ад капіталізму да сацыялізму і наадварот, яны, як англічане, гэта лічаць прыкметай нецывілізаванасці.

Шведскі селянін здаўна карыстаўся адноснай незалежнасцю. Яму ўжо даўно была прадстаўлена свабода самастойна распараджацца сваёй гаспадаркай і па магчымасці рэалізоўваць прадукты сваёй працы. Зараз у сельскай гаспадарцы занята толькі 3% насельніцтва, але вытворчасць заўсёды перавышае попыт. У 1994 годзе ў Швецыі была засуха, ад спякоты загінулі пасевы і ў царквах маліліся, каб Гасподзь паслаў дождж, таму што дрэвы пажаўцелі ў пачатку жніўня, нібы стаяў канец верасня.

Але гэта не выклікала



**На здымку: Н.Андэрсен з беларускімі дзецьмі.**

вялікай трывогі ў шведаў. Яны гаварылі, што запасаў сельскагаспадарчай прадукцыі хопіць ім на 3 гады. Дзякуючы аснашчэнню сельскай гаспадаркі рознымі машынамі і сродкамі для барацьбы са шкоднікамі, ураджай не так моцна залежыць ад надвор'я. Вінаваты не ўмовы надвор'я, а мы самі. Так, у Беларусі лета ў гэтым годзе было сырое. Ад фітафторы папсаваліся бульба і памідоры, але ўраджай можна было б захаваць, калі б былі сродкі для барацьбы з грыбком. Тое самае і з нарыхтоўкамі кармоў для жывёлы. Шмат скошанай травы згніло на нашых лугах. У Швецыі ў сухое лета машына заварочвае сена на лузе плёнкай у цюкі, а ў дажджлівае лета -- заварочвае скошаную траву той жа плёнкай у цюкі на сілас, і цюкі застаюцца ляжаць на лузе! Іх можна забраць і выкарыстоўваць у любы час.

У Швецыі ў калектыве пераважаюць адносіны не начальніка і падначаленага, а членаў каманды, якія робяць агульную справу. Важна не пасада, якую займае чалавек у калектыве, а галоўнае -- старанна выконваць сваю работу. Падтрымліваецца ініцыятыва і вынаходлівасць. У любы час можна звярнуцца да начальніка, які стаіць на самым версе іерархічнай лесвіцы, і той, выявіўшы, што прапанова вартая, пахваліць яго, а калі не заслугоўвае ўвагі, -- усё роўна падзякуе за ініцыятыву. І наогул, у Швецыі незалежнасць чалавека ставіцца на першае месца. Шведы ўжо даўно мелі магчымасць знаёміцца з любымі дзяржаўнымі дакументамі і каля двух стагоддзяў атрымлівалі бясплатную пачатковую адукацыю.

Дарэчы, у Швецыі намнога менш звенняў улады ў параўнанні з іншымі краінамі. Аналагічную з'яву я заўважаў і ў Англіі, калі займаўся на летніх курсах у Оксфардзе. Каб размножыць які-небудзь вучэбны матэрыял, дастаткова звярнуцца толькі да аднаго чалавека (напрыклад, заг. кафедры) і на наступны дзень дапаможнік будзе падрыхтаваны.

Шведы эканомяць шмат часу з-за адсутнасці лішніх ступеняў улады.

Для таго, каб атрымаць пашпарт, ім патрабуецца ўсяго 5 мінут, каб устанавіць тэлефон у кватэры -- 1-2 дні пасля падачы заявы. Таму, калі паўстала пытанне аб уступленні Швецыі ў Еўрапейскі Саюз, яны жартавалі: "Лепш бы яны да нас далучаліся, паколькі ў нас арганізацыя лепшая". Шведы ганарацца сваёй краінай, паўсюдна вывешваючы свой флаг, нават над палаткай на адпачынку.

Шведы любяць адкрытасць, справядлівасць і калі заўважаюць, што вы нешта ўтойваеце, то наўрад ці будуць у будучым мець з вамі справу.

У Швецыі існуе каля 400 "Клубаў Льва", дзе пануюць высокія маральныя прынцыпы:

-- садзейнічаць духу ўзаемаразумення сярод народаў свету;

-- аказваць дапамогу іншым: слабым, бедным;

-- будаваць свой бізнес без шкоды для іншых;

-- абапірацца на высокія этычныя нормы ў камерцыі, прамысловасці;

-- пры ўзнікненні сумненняў у рашэнні спрэчнага пытання вырашаць яго на карысць іншых, а не сваю.

Такія клубы, як "Клуб Вікінгаў", "Ротары-клуб" аказваюць значную дапамогу Наталлі Андэрсен у правядзенні экскурсій для дзяцей па розных гарадах Швецыі. Так, "Клуб Вікінгаў", старшыня якога Густаф Хакер, мінулым летам і летам гэтага года арганізаваў экскурсіі на поўдзень Швецыі, дзе дзеці наведалі тое месца, адкуль казачны персанаж Нільс з кнігі Сельмы Лагерлёф (лаўрэата Нобелеўскай прэміі) пачаў сваё цудоўнае падарожжа па краіне.

Была арганізавана экскурсія ў г.Страфанфорд, дзе дзеці прымалі ўдзел у свяце з выпадку летняга сонцастаяння. У гэтым горадзе нас пазнаёмілі з асаблівасцямі жыцця старых людзей, якія паселены ў спецыяльных дамах. Пакой на аднаго чалавека, з усімі выгодамі: тэлевізар, гарачая вада, душ, туалет.

Н. Андэрсен арганізавала нам экскурсію на поўнач ад Стакгольма ў г.Осцерзунд, дзе ў чэрвені ноччу можна чытаць як днём.

**І.АКУЛАЎ,**
**дацэнт кафедры англійскай мовы.**

**(Заканчэнне ў наступным нумары)**

## ПАЧЫН ЗРОБЛЕНЫ

Сёмы год у нашым універсітэце рыхтуюцца спецыялісты па правазнаўству. Аднак да апошняга часу ні на адной з дзвюх кафедр гэтага профілю не было ніводнага выкладчыка з вучонай ступенню не тое што доктара, а нават кандыдата юрыдычных навук. Пачын зрабіў загадчык кафедры правазнаўства Ю.А.Ключнікаў. Ён падрыхтаваў і на спецыялізаваным Савеце Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь паспяхова абараніў дысертацыю па тэме «Прадмет і спосабы індывідуальна-прававога рэгулявання на стадыі папярэдняга расследавання» на атрыманне вучонай ступені кандыдата юрыдычных навук.

З гэтай нагоды Юрыя Андрэевіча віншуюць рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат і калектыў гісторыка-юрыдычнага факультэта.

## З КАГОРТЫ ВЫПУСКНІКОЎ ГДУ

У свой час выпускнікі некаторых спецыяльнасцей нашага універсітэта мелі ўсесаюзнае размеркаванне. Многія з іх і па сённяшні дзень не парываюць сувязяў з роднай альма-матэр, некаторыя з іх сталі вучонымі. Да іх адносіцца і Ю.П.Кажаеў. У ГДУ ён атрымаў дыплом эканаміста па працы і ўжо многія гады жыве ў Маскве, займаецца навуковай дзейнасцю. Сёлета Юрый Паўлавіч парадаваў свайго навуковага кіраўніка к.э.н., дацэнта В.А.Трухава, які ўзначальвае кафедру гісторыі і тэорыі дзяржавы і права на гісторыка-юрыдычным факультэце нашага універсітэта. Масквіч паспяхова абараніў у Акадэміі дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі дысертацыю і нядаўна зацверджаны ў вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.

Цяпер Ю.П.Кажаеў працуе прарэктарам па навукова-метадычнай рабоце ў Маскоўскім гуманітарным інстытуце і адначасова з'яўляецца рэктарам створанага ім недзяржаўнага Маскоўскага інстытута прававой эканомікі.

**(Наш кар.)**

ВНУ -- ліцэй

## СУПРАЦОЎНІЦТВА БУДЗЕ КАРЫСНЫМ

Калектыў кафедры батанікі і фізіялогіі раслін разам з дэканам біяфака ў адзін з лістападаўскіх дзён сталі жаданымі гасцямі ў абласным ліцэі, што па вул.Жаркоўскага г.Гомеля. Візіт сюды выкладчыкаў ГДУ не быў выпадковасцю. Тут працуе дырэктарам Сяргей Анатольевіч Рыдны, адзін з лепшых выпускнікоў біялагічнага факультэта, які не парывае сувязі з роднай ВНУ. Да таго ж сярод ліцэістаў, якія займаюцца тут па 9 профілях, ёсць юнакі і дзяўчаты, што выбралі для паглыбленага вывучэння такія прадметы, як біялогія і хімія.

Таму мэтай наведання ліцэя стала наладжванне ўзаемакарысных кантактаў паміж факультэтам, кафедрай і профільнымі класамі, знаёмства з вучэбным працэсам, умовамі, створанымі тут для здольнай і таленавітай моладзі з ўсёй Гомельскай вобласці (перад залічэннем у ліцэй яна прайшла жорсткі конкурсны адбор).

З першых мінут знаёмства гасцям было чаму здзівіцца: былое памяшканне гарадскога ПТВ будаўнікоў ператварылася пасля капітальнага рамонту ва ўтульную, прыгожую, аснашчаную навейшым абсталяваннем навучальную ўстанову. Экскурсія па экалагічнаму цэнтру, які не мае аналагаў у рэспубліцы, дзе сабрана флора і фауна з розных краін свету, устаноўлены прыгожыя акварыумы, знаёмства з унікальным праекцыйным комплексам, які дае магчымасць выхаду ў міжнародную камп'ютэрную сетку -- Інтэрнет (такіх комплексаў у Беларусі толькі два), уразілі гасцей надзвычайна. Не менш захапляючым было для іх знаёмства з багатай калекцыяй фіялак, з асаблівай любоўю сабранай выкладчыкам ліцэя, таксама выпускніком біяфака П.В.Уласавым.

Асаблівую цікавасць выклікала ва універсітэцкіх выкладчыкаў наведанне адкрытага сумешчанага ўрока па біялогіі і хіміі ў адным з профільных класаў. Яго вялі настаўніцы Л.Ф.Сіткарова і Л.Г.Кудравец, якія ў свой час закончылі біяфак ГДУ. Была дадзена высокая ацэнка ўроку, на якім ліцэісты паказалі свае выдатныя веды.

Потым адбылася размова за "круглым сталом" аб тым, як наладзіць больш цесныя і карысныя сувязі паміж біяфакам і ліцэем, паколькі апошні з'яўляецца звяном ў сістэме непарыўнага навучання "Школа -- ВНУ", і з якім нашым універсітэтам заключаны дагавор аб супрацоўніцтве. Гучалі прапановы кіраўнікоў факультэта, кафедры і работнікаў ліцэя аб сумеснай дзейнасці як у навуковым, так і вучэбна-метадычным накірунках: гэта і магчымасць падрыхтоўкі з ліку студэнтаў ГДУ педагагічных кадраў для ліцэя, выданне сумесных навуковых рэкамендацый, якімі змогуць карыстацца настаўнікі прыродазнаўчых дысцыплін школ вобласці, дапамога кафедры батанікі і фізіялогіі раслін у навуковым забеспячэнні планаемага будаўніцтва ў ліцэі аранжарэі і інш.

У сваю чаргу, ліцэй можа даваць студэнтам біяфака магчымасць карыстацца пры напісанні курсавых і дыпломных работ камп'ютэрнай сеткай з выхадам у Інтэрнет, каб атрымаць неабходную інфармацыю ў любой бібліятэцы свету. А тыя студэнты, хто зацікавіцца экспанатамі экалагічнага цэнтра, таксама могуць атрымаць аб іх падрабязную інфармацыю, што потым спатрэбіцца ў іх самастойнай педагагічнай рабоце.

У час сустрэчы было выказана спадзяванне, што многія ліцэісты, якія займаюцца па хіміка-біялагічнаму профілю і ў грунтоўных ведах якіх пераканаліся выкладчыкі , папоўняць у будучым студэнцкую сям'ю ГДУ .

**Т.НІКАЛАЕВА.**

Конкурс

## "ЕДЗЕМ У ФРАНЦЫЮ-98"

Пад такой назвай Міністэрства замежных спраў Францыі аб'явіла сусветны конкурс для школьнікаў і студэнтаў, паспяховаму правядзенню якога будуць садзейнічаць каля 120 французскіх пасольстваў, што працуюць на ўсіх кантынентах. Гэтая акцыя пры садзейнічанні Міністэрства адукацыі Беларусі пройдзе і ў нашай рэспубліцы.

Такі шырокі размах конкурсу непасрэдна звязаны з чэмпіянатам свету па футболу, які адбудзецца ў наступным годзе ў Францыі. Фінальныя спаборніцтвы, а ў іх прымуць удзел 32 нацыянальныя зборныя, плануецца правесці ў дзесяці гарадах краіны. Чакаецца, што на матчах пабываюць 2,5 мільёна гледачоў. Сярод іх могуць аказацца і пяцёра нашых землякоў ад 17 да 20 гадоў, хто найбольш паспяхова пройдзе тэсціраванне.

Пераможцы конкурсу будуць не толькі прысутнічаць на матчах чэмпіянату свету, але і прымуць удзел ва ўрачыстасцях з нагоды Нацыянальнага свята Францыі 14 ліпеня.

**(БЕЛТА).**



## "МЫ ПАЙШЛІ НЕ Ў СЕКТУ, А ВА УНІВЕРСІТЭТ"

**Як паведамлялася ўжо ў нашай газеце, у ГДУ адбыўся семінар для псіхолагаў, псіхатэрапеўтаў і псіхіятраў "Праблемы псіхалогіі зменёнай свядомасці".**

Такія семінары для тых, хто прафесійна займаецца псіхалогіяй, сталі ўжо добрай традыцыяй. Усё больш зацікаўленых удзельнікаў прыцягваюць такія мерапрыемствы. Асноўная іх частка -- студэнты-псіхолагі, якія адзначаюць, што для іх гэта дадатковая ўнікальная магчымасць пашырэння прафесійнага кругагляду і вопыту, кола прафесійных зносін, творчага самавыяўлення.

У семінарах актыўны ўдзел прымаюць практычныя псіхолагі -- учарашнія выпускнікі факультэта павышэння кваліфікацыі універсітэта і псіхатэрапеўты, якія працуюць у псіхічных цэнтрах, школах, паліклініках, бальніцах.

Семінар заўсёды становіцца яркім, незабыўным святам, якое ўключае ў сябе сустрэчы з мастакамі, фотамастакамі, людзьмі розных прафесій, якіх аб'ядноўвае агульная рыса -- цікавасць да псіхалогіі. На сёлетні семінар акрамя гамяльчан прыехалі псіхолагі з Рэчыцы, Мазыра, Калінкавіч, Жлобіна. Цікавасць да яго была абумоўлена заяўленай тэмай. Практычна кожны чалавек мае пэўны вопыт перажывання зменёных станаў свядомасці: трансавых, псіхадэлічных, гіпнатычных і г.д. Яны (гэтыя станы) могуць наступаць у працэсе заняткаў аўтатрэнінгам, медытацыямі, у выніку крайніх тэмпературных уздзеянняў, галадання, зменёнага дыхання, музыкі, выкарыстання тых або іншых рэчываў. Пэўнае змяненне свядомасці адбываецца пад уплывам масавых сродкаў інфармацыі, рэкламы, камп'ютэрных гульняў з выкарыстаннем віртуальнай рэчаіснасці. Многія дзейнічаючыя секты рэлігійнага накірунку абапіраюцца ў сваёй дзейнасці на выкарыстанне тэхнікі, пры дапамозе якой мяняецца стан свядомасці чалавека. І ў гэтым ёсць вялікая небяспека, асабліва для маладых людзей, якія знаходзяцца ў актыўным пошуку. Паколькі стан раўнавагі тут дасягаецца не за кошт актывізацыі ўласных рэсурсных магчымасцей псіхікі (кожны валодае такім патэнцыялам), а за кошт пазбягання рэальнасці, змяняючы стан свядомасці. Часта чалавек давяраецца таму ці іншаму Настаўніку (Гуру) і можа страціць уласнае "Я", згубіць у пэўнай ступені арыентацыі ў рэальным свеце, "заглытваючы" без крытыкі любыя інструкцыі і настаўленні. Адбываецца, па сутнасці, своеасаблівае "замбіраванне". Вось аб гэтым ішла дыскусія на семінары.

У рамках выступленняў аспіранта ГДУ Аляксандра Крыленкі, доктараў-псіхатэрапеўтаў Паўла Юдаша і Святланы Кузьміч, кандыдата філалагічных навук дацэнта Вячаслава Капыткі былі закрануты розныя аспекты праблемы псіхалогіі зменёнага стану свядомасці: перавагі і небяспека зменёных станаў свядомасці, як гэта можа паўплываць на далейшае жыццё чалавека, якія ўмовы садзейнічаюць асабістаму росту пры выкарыстанні тэхнікі ўваходжання ў зменёны стан свядомасці, як абапіраюцца на гэта розныя псіхатэрапеўтычныя школы: нейралінгвістычнае праграміраванне, псіхадрама, бібліятэрапія і інш.

У семінары прымаў актыўны ўдзел студэнцкі псіхалагічны тэатр "ПІК". Гэта было імправізаванае дзейства, накіраванае на ўсведамленне некаторых аспектаў заяўленай тэмы семінара. У далейшым гэта надало вастрыню дыскусіі. Хочацца адзначыць, што пікаўцы (гэта студэнты V курса спецыяльнасці "Практычная псіхалогія") за гэты год выраслі, сталі адзінай камандай. Многія з іх ужо спрабуюць сябе ў практычнай дзейнасці псіхолага.

Мы ўзялі некалькі інтэрв'ю ва ўдзельнікаў семінара.

**С.Струк, псіхолаг, Гомельская абласная псіхіятрычная бальніца N1:**

-- Семінар выклікаў у мяне шмат асацыяцый і прыемна здзівіў актуальнасцю зместу і духам творчасці.

Мне хочацца думаць, пазнаваць, тварыць. Я атрымала новы вопыт у адчуваннях і марах, у нерэальным і рэальнасці.

**А.Крыленка, аспірант ГДУ:**

-- Важна, што разам з інфармацыяй па зменёных станах свядомасці семінар усімі сваімі выступленнямі гаварыў аб неабходнасці ўсведамлення і магчымасці пераадолення ўнутраных абмежаванняў як у плане асабістага росту, так і ў навуковым успрыманні, і ведах.

**А.Кучарава, псіхолаг, СШ N30 г.Гомеля:**

-- Мы гаварылі аб небяспецы, да якой можа прывесці абраная тэма, аб тым, "куды і з кім" нам, удзельнікам семінара, варта ісці далей. Я зведала радасць ад таго, што мы, не заўважыўшы таго самі, ужо пайшлі, зрушылі з мёртвай кропкі -- і пайшлі не да псеўдагуру, не ў малельны дом і не ў секту -- а пайшлі ва універсітэт, дзе змаглі гаварыць аб праблемах, якія нас цікавяць, з прафесіяналамі, а не з шарлатанамі.

Мы хочам падзякаваць рэктарат Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, пры падтрымцы якога стала магчымым правядзенне семінара. Словы ўдзячнасці хочацца выказаць таксама ў адрас прафкома студэнтаў, культурнага цэнтра універсітэта.

**Г.ГАТАЛЬСКАЯ, В.ФІЛІПЕНКА,**
**арганізатары і вядучыя семінара.**

## ПАДАРОЖЖА Ў МІНУЛАЕ

Жыць у горадзе і не ведаць яго гісторыю -- гэта амаль што не жыць у ім.
На вялікі жаль, не ўсе мы ведаем гэтую гісторыю. Днямі са студэнтамі
філалагічнага факультэта была наладжана экскурсія па мясцінах
архітэктурных помнікаў г. Гомеля. Арганізаваў гэтае мерапрыемства за-
гадчык кафедры беларускай культуры дацэнт Д.Д.Паўлавец.
Супрацоўніца краязнаўчага музея прадставіла нам старажытную пана-
раму Гомеля і пазнаёміла нас з архітэктурай горада. Мы даведаліся аб
вельмі цікавых рэчах. Напрыклад, наш універсітэцкі скверык, у якім мы
любім адпачываць у вольны час, размешчаны на былых гарадскіх могілках,
дзе, як мяркуюць даследчыкі, была пахавана Ганна Іванаўна Паскевіч. У
час экскурсіі мы наведалі таксама наш гарадскі парк, пазнаёміліся з
гісторыяй яго стварэння і спусціліся ў сямейны склеп князя Паскевіча.
Мы даведаліся і аб тым, што стары будынак універсітэта чыгуначнага
транспарту раней быў мужчынскай гімназіяй, дзе свае веды пашыраў
пазней вядомы вучоны П.О.Сухі, а політэхнічны тэхнікум -- былая жано-
чая гімназія, дзе таксама вучылася наша славутая зямлячка Г.Дакутовіч.
Шмат яшчэ чаго можна даведацца аб гісторыі свайго горада з такой
невялікай экскурсіі. Ад імя ўсіх першакурснікаў мы выказваем вялікую
падзяку Д.Д.Паўлаўцу за гэтае цікавае пранікненне ў мінулае. Спадзяём-
ся, што гэта не апошняе наша падарожжа за сцены універсітэта.

**С.ЗАХАРАВА, А.НЕКРАШЭВІЧ,**
**студэнткі гр. Б-12 філалагічнага факультэта.**

З тэатральнага жыцця горада

## ПА СУЧАСНАЙ ПРАБЛЕМАТЫЦЫ

У Незалежным тэатры адбыўся чарговы спектакль па п'есе В.Драгунскай "Дом для зачатий". Пастаноўку прыйшлі паглядзець і студэнты філалагічнага факультэта нашага універсітэта. Прадстаўленне прайшло пры поўнай зале, што, магчыма, можна растлумачыць сучаснасцю праблематыкі п'есы, якая дае новае пераасэнсаванне трагічных падзей дваццатага стагоддзя, выяўляе складанае перапляценне і драматызм чалавечых лёсаў, ставіць пытанне супярэчлівых узаемаадносін асобы і грамадства. Усё гэта разам з інтрыгуючым незвычайным сюжэтам, таленавітым выкананнем акцёрамі сваіх роляў не магло не выклікаць цікавасці аматараў тэатральнага мастацтва.

І хаця ў кожнага з нас засталіся свае ўласныя, асабістыя ўражанні ад убачанага на сцэне, сустрэча з сапраўдным мастацтвам нікога не пакінула раўнадушным.

**Святлана КАГАН,**
**студэнтка групы БА-23 філалагічнага факультэта.**

*Спорт* *Спорт* *Спорт* *Спорт* *Спорт* *Спорт*

## ЧЭМПІЁНКІ НЕ МЕЛІ КАНКУРЭНЦЫІ

На працягу пяці дзён у сталіцы нашай краіны -- Мінску праходзілі фінальныя гульні жаночых каманд па ручному мячу па праграме студэнцкай спартакіяды. Узнагароды аспрэчвалі шэсць мацнейшых каманд. Па-за канкурэнцыяй аказаліся гандбалісткі нашага універсітэта (ст.трэнер В.Крукоўскі). З разгромным лікам -- 62:7 -- яны перамаглі студэнтак Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Не аказалі ім сур'ёзнага супраціўлення і астатнія саперніцы. У спартсменак Брэсцкага, Гродзенскага і Магілёўскага дзяржаўных педагагічных універсітэтаў нашы дзяўчаты выйгралі адпаведна 37:23, 44:26, 35:19. Не вытрымала націску гамяльчанак і каманда Акадэміі фізічнага выхавання і спорту, якая ўступіла з лікам 27:34.

У чэмпіёнак добрую гульню прадэманстравалі другакурсніца Марына Жукава з геолага-геаграфічнага і Таццяна Швец з эканамічнага факультэтаў, першакурсніцы Аксана Сафонава, Вольга Кудраўская і студэнтка другога курса Алена Рагавец з факультэта фізічнай культуры.

## НА ПАМОСЦЕ -- ВОЛАТЫ

У спартыўным комплексе "Гомсельмаш" прайшоў чэмпіянат вобласці па паўэрліфтынгу -- сілавому трохбор'ю, у якім прынялі ўдзел 22 каманды гарадоў і раёнаў.

Бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы-97 другакурснік факультэта фізічнай культуры Уладзімір Гадуноў (67,5кг) заваяваў чэмпіёнскае званне. Яго ўдастоены і ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту Уладзімір Галавач (90 кг). Міхаіл Антропаў (56 кг), Дзмітрый Глухотка (100 кг) і Сяргей Гуцаў (90 кг) заваявалі сярэбраныя ўзнагароды (усе з факультэта фізічнай культуры). На трэцюю прыступку п'едэстала гонару падняліся: трэцякурснік гісторыка-юрыдычнага факультэта Дзмітрый Струцінскі (67,5 кг) і выпускнік фізічнага факультэта Сяргей Грышчанка (75 кг).

## АПРАЎДАЎ СПАДЗЯВАННІ ТРЭНЕРАЎ

У г.Магілёве праведзены міжнародны турнір па вольнай барацьбе на прызы памяці Героя Савецкага Саюза М.Ф.Каралёва. На спаборніцтвах у вагавай катэгорыі 54 кг выдатна выступіў першакурснік эканамічнага факультэта нашага універсітэта Дзмітрый Галайда. Ён аказаўся мацнейшым за ўсіх сапернікаў, заваяваў вышэйшую ўзнагароду і выканаў нарматыў майстра спорту Рэспублікі Беларусь.

Нагадаем, што такога значнага поспеху Дзмітрый дасягнуў праз дзесяць гадоў упартых трэніровак. Ён -- выхаванец ДЮСШ пры ГДУ, сёлета з залатым медалём закончыў Гомельскае вучылішча алімпійскага рэзерву і выбраў прысвяціць сваё жыццё важнай спецыяльнасці эканаміста.

Дасягненне Дзмітрыя Галайды -- гэта і плён працы яго трэнераў Ю.Петухова і А.Хатылёва.

## ЗНОЎ НЕ БЫЛО РОЎНЫХ

У Мінску завяршыліся рэспубліканскія спаборніцтвы па вольнай барацьбе ў праграме спартакіяды ВНУ.

Пераможцамі ў асабістых спаборніцтвах сталі: аспірант кафедры фізвыхавання і спорту Мікалай Краснапееў і першакурснік факультэта фізічнай культуры Валерый Кузьмянкоў. На рахунку нашай дружыны яшчэ чатыры прызёры і першае агульнакаманднае месца, як і ў мінулыя гады.

В.МАРЧАНКА.

*СТАНЬЦЕ СТРОЙНЫМІ І ПРЫВАБНЫМІ!*

*Запрашаем студэнтак у групу аэробікі. За даведкамі звяртацца па тэл. 53-73-49.*



*Апошні асенні ліст.* Фота У.Чысціка.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.Скарыны**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- рускай літаратуры -- асістэнта;
-- нямецкай мовы -- ст.выкладчыка;
-- ВМ і праграміравання -- заг.кафедры;
-- эканамічных тэорый -- дацэнта;
-- бухгалтарскага ўліку, кантролю і АГД -- ст.выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

РЭКТАРАТ.

Дэканат фізічнага факультэта, калектыў кафедры агульнай фізікі выказваюць глыбокае спачуванне лабарантцы КАЛАДКО Таццяне Анатольеўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці БАЦЬКІ.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 453.
Падпісана да друку 21.11.97.